2. *Генчэль, Г., Тэш, С.* Трасянка: у якой ступені яна руская, беларуская або агульная? (На матэрыяле маўленчай практыкі адной сям'і) // Веснік БДУ. – Сер. 4.– № 1 – 2007. – С. 85-91.
3. *Запрудскі С.М., Яненка Н.В.* Варыянтнасць у вусным гарадскім маўленні: унутранае і сацыяльнае вар'іраванне (на матэрыяле запісаў у гарадскім пасёлку Хоцімск) // Беларускае слова: гісторыя і сучаснасць: зб. арт. па матэр. навук. чыт., прысвеч. памяці праф. А.І. Жураўскага, Мінск, 27.10.2009 г. – Мінск, 2010. – С. 63-66.
4. *Запрудскі С.М., Яненка Н.В.* Фанетычная варыянтнасць у вусным гарадскім маўленні (на матэрыяле запісаў у г. п. Хоцімску) // Зб. арт. па матэр. міжнар. навук. канферэнцыі «Мова – Літаратура – Культура», Мінск, 28 – 29.10.2010 г. – Мінск, 2010. – С. 102-108.
5. *Запрудскі С.М., Яненка Н.В.* Моўцы перад выбарам паміж цвёрдым і мяккім /ч/ (на матэрыяле хоцімскай часткі альдэнбургскага корпуса змешанага маўлення) // Памежжа ў моўнай, гістарычнай і культурнай перспектыве: Міжнар. навук. канф., Мінск, 12 – 13.11.2010 г. (У друку).
6. *Запрудскі С.М., Яненка Н.В.* Марфалагічная варыянтнасць у вусным гарадскім маўленні (на матэрыяле запісаў у гарадскім пасёлку Хоцімск) // IX Междунар. науч. конф. «Язык и социум», Минск, 3 – 4.12.2010 г. (У друку).
7. *Запрудскі С.М., Яненка Н.В.* Моўцы перад выбарам суфікса *-ў* або *-л* у дзеясловах прошлага часу адзіночнага ліку мужчынскага роду (на матэрыяле запісаў у гарадскім пасёлку Хоцімск) // Тыпалогія ўзаемасувязей беларускай і рускай моў і праблемы нацыянальнай самаідэнтыфікацыі: матэр. міжнар. навук. канф., Мінск, 19 – 20.04.2011 г. – Мінск, 2011. – С. 121-126.
8. *Яненка Н.В.* Да пытання аб фанетычным і марфалагічным вар'іраванні ў вусным гарадскім маўленні (на матэрыяле запісаў у г. п. Хоцімску) // Зб. артык. па матэр. навук. канферэнцыі студэнтаў БДУ, Мінск, 28.042010 г. http://www.nirs.bsu.by/Документы/Конференция%20БГУ/67конференция/ТОМ%202.pdf Дата доступу – 28.04.2011 г.

***В.Р. Ермаковіч***

# Крыж Ефрасінні Полацкай: з гісторыі вывучэння

Кожнаму беларусу вядома імя Ефрасінні Полацкай, нашай першай святой, якая зрабіла вялікі ўклад у асветніцтва, у духоўнае жыццё на беларускіх землях у XII ст. Яе спадчына – неацэнны скарб для гісторыі краіны. Жыццё полацкай князёўны яна прамяняла на манастырскія сцены і служэнне пашырэнню асветы на роднай змялі. З імем Ефрасінні Полацкай звязана стварэнне славутага крыжа.

### *Крыж Ефрасінні Полацкай*

Крыж быў выраблены майстрам Лазарам Богшам у 1161 годзе па просьбе асветніцы. Гэта быў сапраўдны шэдэўр. Крыж меў шасціканцовую форму, шырокае выкарыстанне якой у Заходняй Еўропе пачалося ў VII – VIII стст. Шасціканцовы крыж быў цесна звязаны з Візантыйскай традыцыяй.

На верхніх канцах крыжа Ефрасінні Полацкай былі змешчаны выявы Ісуса Хрыста, Багародзіцы і Іаана Прадцечы; у цэнтры ніжняга перакрыжавання знаходзіліся выявы чатырох евангелістаў: Лукі, Матфея, Марка і Іаана; па баках – архангелы Гаўрыіл і Міхаіл, знізу – святая Ефрасіння Александрыйская і святыя мучанікі Георгій і Сафія. На адваротным баку крыжа – выявы Іаана

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

Златавуста, Васіля Вялікага, Грыгорыя Багаслова, апосталаў Пятра і Паўла, а таксама святых Стэфана і Панцеляймона. Надпіс, выкананы часткова грэчаскімі, а часткова славянскімі літарамі. У пяці квадратных гнёздах, размешчаных у сярэдзіне крыжа, знаходзіліся наступныя рэліквіі: кропля крыві Ісуса Хрыста, часцінка крыжа, на якім Хрыстос быў распяты, драбок каменя ад гроба Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзімітрыя.на, Дзімітрыя і Панцеляймона. Кожная з выяў мела надпіс, выкананы часткова грэчаскімі, а часткова славянскімі літарамі. У пяці квадратных гнёздах, размешчаных у сярэдзіне крыжа, знаходзіліся наступныя рэліквіі: кропля крыві Ісуса Хрыста, часцінка крыжа, на якім Хрыстос быў распяты, драбок каменя ад гроба Багародзіцы, часткі мошчаў святых Стэфана і Панцеляймона, а таксама кроў святога Дзімітрыя.

### *Надпіс на крыжы*

Акрамя пералічанага вышэй, на крыжы знаходзіцца яшчэ і надпіс з карыснымі гістарычнымі звесткамі. Змест надпіса наступны: *“Въ лето 6669 покладаеть Офросинья чьстьный крсть въ манастыри своемъ въ црькви святого Спаса. Чьстьное древо бесценьно есть, акованье и жьнчюгъ въ 100 гривнъ а да… 40 гривнъ. Да не изнесеться из манастыря никогда же, яко ни продати ни отдати. Аще се кто преслоушаеть, изнесеть и от манастыря, да не боуди емоу помощникъ чьстьныи крестъ ни въ сь векъ, ни въ боудоущий, и да боудеть проклятъ святою животворящею троицею и святыми отци 300 и 50 семию съборъ святыхъ отець и боуди емоу часть съ Июдою, иже преда Христа. Кто же дрьзнеть сътворити се, властелинъ или князь, или пискоупъ, или игоуменья, или инъ который любо человекъ, а боуди емоу клятва си. Офросинья же, раба Христова, сътяжавъши крестъ сий, приметь вечную жизнь съ всеми святыми”.*

### *Гісторыя крыжа і яго знікненне*

Нягледзячы на праклён, змешчаны ў другой частцы надпіса, які павінен быў забяспечыць знаходжанне святыні ў манастыры, крыж неаднойчы вывозілі з Полацка. У 1514 годзе Васіль III захапіў Смаленск і забраў крыж у Маскву. У 1563 годзе Іван Жахлівы вярнуў крыж царкве святога Спаса пад час аблогі Полацка. Але ўжо ў 1579 годзе Полацк захапілі войскі караля Польшчы і вялікага князя Літоўскага Стэфана Баторыя, і царква Спаса перайшла да езуітаў. З гэтага часу крыж захоўваўся ў Сафійскім саборы. Езуіты нават распачалі судовы працэс, каб вярнуць крыж у Спаса-Ефрасіннеўскую царкву, разумеючы яго ўплыў на вернікаў-беларусаў. Галоўным іх аргументам быў старажытны надпіс. Аднойчы яны нават спрабавалі хітрасцю падмяніць крыж, але ў іх нічога не атрымалася.

У 1812 годзе, калі Полацк некалькі месяцаў знаходзіўся пад акупацыяй французаў, крыж захоўваўся ў сцяне Сафійскага сабора ў замураванай нішы, а ў 1841 годзе, падчас хроснага ходу рэліквію перанеслі ў храм Спаса. Там крыж захоўваўся ў келлі, дзе найпадобнейшая Ефрасіння пражыла свае апошнія гады.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

Яшчэ да гэтага архіепіскап Васіль Лужанскі наведаў з крыжам Маскву і Пецярбург. У паўночнай сталіцы крыж агледзеў сам імператар Мікалай І.

У 1921 годзе, ужо пры савецкай уладзе, святыню рэквізавалі бальшавікі, а ў 1929 годзе крыж трапіў у Магілёў, куды ўлады меркавалі перанесці сталіцу БССР. У 30-я гады ХХ ст. крыж быў перавезены з музея ў будынак зямельнага банка, дзе знаходзіліся абкам і гаркам партыі. Адтуль крыж і знік у 1941 годзе. Месцазнаходжанне яго не вядома. Па афіцыйнай версіі, крыж выкралі фашысцкія захопнікі. Неаднойчы пісалася, што крыж можа знаходзіцца і ў Нью-Йорку у прыватнай калекцыі мільянераў Морганаў. У апошні ж час, папулярнасць набыла версія, што сляды крыжа вядуць на тэрыторыю Расіі.

У 90-я гады ХХ ст. пошукамі нашай знакамітай рэліквіі займаліся журналіст Алесь Лукашук, навуковец Адам Мальдзіс. Але пошукі ў Нью-Йорку завяршыліся пасля таго, як Міністэрства замежных спраў Беларусі атрымала афіцыйны адказ, што ў самой фундацыі Морганаў крыжа няма.

### *Копіі крыжа*

Колькі слоў неабходна сказаць і пра копіі крыжа. Як адзначае Уладзімір Арлоў, у “Хроніцы Быхаўца” ёсць згадка пра дачку полацкага князя Васіля Параскеву, што была абвешчана ў Рыме святою пад імем Праксэды. Гэтая князёўна пастрыглася ў манастыр Спаса над Палатой, дзе сем гадоў перапісвала кнігі. Потым аддана служыла Богу ў Рыме, дзе памерла і была пахавана; там у яе гонар пабудавалі бажніцу. Некаторыя лічаць гэтае летапіснае апавяданне каталіцкай рэдакцыяй жыццяпісу Ефрасінні. Захаваліся звесткі і пра крыж з надпісам і часткай святога дрэва, падараванага Праксэдзе рымскім папам Аляксандрам IV. Гэты крыж і з’яўляецца першай копіяй крыжа Ефрасінні Полацкай. Цяпер ён знаходзіцца ў Яраслаўска-Растоўскім музеі-запаведніку.

Другая, вядомая копія, была зроблена езуітамі з мэтаю выкрадання арыгінала з уніяцкага Сафійскага сабора.

І, нарэшце, самая вядомая копія – зробленая ў наш час у 1997 годзе майстрам з Брэста Мікалаем Кузьмічом. Сам Філарэт прывозіў з Ерусаліма для крыжа часткі мошчаў святых, часткі камянёў з Гроба Господняга і Гроба Багародзіцы. Цяпер гэтая копія захоўваецца ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры ў Полацку.

### *З гісторыі вывучэння крыжа*

Шмат беларускіх навукоўцаў звярталася да вывучэння крыжа і надпіса. Але, на жаль, больш увагі надавалася апісанню выгляда крыжа і яго гісторыі, чым надпісу на ім. Адным з першых даследчыкаў крыжа быў Ігнат Кульчынскі (1707 – 1747). Ён нарадзіўся ў Гродна, быў гісторыкам, дзеячам уніяцкай царквы, доктарам тэалогіі. Доўгі час жыў у Рыме (з 1727 па 1735 год). У 1736 – 1747 гг. быў архімандрытам Барысаглебскага (Каложскага) манастыра ў Гродна. Нейкі час жыў у полацкай Сафіі, дзе ўбачыў крыж Ефрасінні Полацкай і апісаў яго ў сваіх працах, дзякуючы чаму нашая рэліквія стала вядома на Захадзе. І.Кульчынскага нездарма называюць першым даследчыкам беларускіх старажытнасцей.

Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)

Вывучэннем крыжа ў наш час займаліся такія даследчыкі, як У.Арлоў, К.Тарасаў, якія прывялі ў сваіх працах падрабязнае знешняе апісанне крыжа, яго гісторыю і знікненне. У.Арлоў надрукаваў і сам надпіс з падзелам на пласцінах. Падрабязна святыня была апісана Леанідам Аляксеевым і Паўлам Аляксеевым, які ў сваёй працы 1966 г. апісаў знешні выгляд крыжа. Грунтоўнае апісанне крыжа (з прыкладаннем яго фотакопіі) зрабіў акадэмік Б.А. Рыбакоў [1].

**Літаратура**


1. *Рыбаков Б.А.* Русские датированные надписи XI – XIV веков // Археология СССР. Свод археологических источников. – Выпуск Е 1 – 44. – Москва, 1964.


Create PDF files without this message by purchasing novaPDF printer (http://www.novapdf.com)